**В.М. САЎЧАНКА**
Рэспубліка Беларусь, Магілёў, УА «МДУ ім. А.А. Куляшова»

# ПЕРЫЯД І ВОБРАЗНЫЯ СРОДКІ Ў ТВОРАХ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

Перыяд як яскравая стылістычная фігура ўжо сам па сабе з'яўляецца прыметай мастацкага або публіцыстычнага стылю, а гэта значыць, што ён не можа існаваць асобна ад уласцівых для названых стыляў сродкаў вобразнасці. Уздзейнічаючы на эмацыянальную сферу рэцыпіента, перыяд можа спалучаць у сабе разнастайныя вобразныя сродкі (тропы). Метафара, метанімія, сінекдаха, параўнанне, перыфраза, алегорыя надаюць фразам іншае значэнне, павялічваючы выразнасць выказанай думкі: «...слова-паняццё пераводзіцца ў слова-вобраз і пачынае выражаць новы, непаўторны мастацкі вобраз, створаны ўяўленнем пісьменніка ў адпаведнасці з яго эстэтычнай ацэнкай» [1, с. 49]. Выбар тропаў заўсёды абумоўлены шэрагам фактараў, але ў першую чаргу залежыць ад таго, які спосаб уздзеяння на чытача абірае аўтар: грунтоўнае перакананне, падрабязнае апісанне, своеасаблівае разважанне, незвычайнае супастаўленне на першы погляд звычайных з'яў, нечаканае тлумачэнне прывычнай жыццёвай сітуацыі ці інш. Тропы, як вядома, дапамагаюць вылучыць звычайныя, паўсядзённыя з'явы з шэрай, аднароднай масы, прычым не толькі выклікаюць да іх увагу рэцэпіента, але і прымушаюць задумацца над сэнсам існавання гэтых з'яў.

Найбольш часта ў перыядзе выкарыстоўваецца метафара, на якой можа быць цалкам пабудаваны твор, напрыклад, верш А. Глобуса «Меліярацыя». Рэзкія метафары ў павышэнні танальнасці ўсяго названага твора ці асобнага яго выказвання (*каня рассячэ далягляд, шчупакі плаўнікамі спілуюць чырвоныя сосны, цягнікі цяжкія галовы падымуць, экскаватары залямантуюць* і інш.) паступова прыводзяць да метафарычнага паніжэння ў творы. Абцяжаранае метафарамі павышэнне танальнасці перыяду і кароткае, лаканічнае, метафарычнае паніжэнне не зацямняюць сэнсу сказанага, а, наадварот, звяртаюць увагу чытача на ўзнятую аўтарам праблему, адзначаюць яе важкасць.

Часта ў перыядзе метафара выкарыстоўваецца ў спалучэнні з метаніміяй, сінекдахай.

Цяжка жыць у цемнаце,
У знявазе чорнай, здзеку,
Дзе адбітак свой з-за хлеба
Накладае талака,
Дзе так пільна праца трэба,
Плечы моцныя, рука,
Дзе рот лішні на прымеце,
І так топчацца сям'ёй, –
Лепш бы там не жыць на свеце
Дзеткам з чулаю душой!

*Я. Колас. Сымон-музыка*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І метанімія, і сінекдаха садзейнічаюць вылучэнню пэўных слоў і сло-вазлучэнняў з агульнага кантэксту (*трэба плечы моцныя, рука; рот лішні на прыкмеце* замест *трэба моцны гаспадар; чалавек лішні на прыкмеце*), спрыяюць засяроджванню ўвагі рэцыпіента на пэўнай мастацкай дэталі.

Як вядома, метафара ўзнікла з параўнання. Параўнанне таксама мо-жа ўключацца як у павышэнне, так і ў паніжэнне танальнасці перыяду. Ні-абходна заўважыць, што перыяд цалкам можа быць пабудаваны на пры-цыпе параўнання, супастаўлення пэўных асоб, прадметаў, з'яў. Гэта на-званы параўнальны перыяд:

Ляпей жабрачы лёс,
У рукі кій, за плечы торба;
Ляпей страха нябёс,
Бясконцы шлях і ліры корба;
Ляпей чужынны золь,
Сцякаць ад горкай працы потам;
Ляпей, не змогшы боль,
Сканаць самотнаму пад плотам
Але не лёс раба
З бязволля ўласнага й бяссілля;
Не гэтая жальба,
Не скутыя рабамі крыллі.

*У. Жылка. Ляпей жабрачы лёс*

Выкарыстанне перыфразы «як семантычна непадзельнага апісаль-нага выразу, з дапамогай якога перадаецца сэнс другога слова або выразу» [2, с. 100], таксама абумоўлена асноўнай мэтай перыяду – уздзеяннем на эмацыянальную сферу чытача ці слухача. Таму перыяд можа быць поў-насцю сканструяваны на перыфразе. Яскравы прыклад – урывак з паэмы П. Труса «Дзесяты падмурак»:

Край легенд,
Крыжоў, магіл-курганаў,
Край тугі –
Бальзам жывых крыніц…
Край смугі,
Бялявых кос-туманаў,
Край палёў,
Краса шумлівых ніў…
Край балот,
Нізін, азёраў наскіх
Край лясоў,
Маўклівых сосен-струн…
Край паэм,
Адвечных песень-казак –
Дарагая сэрцу
Беларусь…

Як бачым, для апісальнага тлумачэння слова *Беларусь* падабраны нават некалькі перыфраз, якія ў спалучэнні ствараюць павышэнне танаць-насці перыяду. Ужыванне гэтага стылістычнага сродку дазваляе аўтару не проста вылучыць нейкую тэму для разважання, але і даць ёй дастаткова поўную характарыстыку.

Дзейсным сродкам выяўлення аўтарскіх адносін да жыцця з'яў-ляецца алегорыя як «увасабленне адцягненага паняцця, думкі з дапамогай канкрэтнага вобраза» [2, с. 16]. Выкарыстанне ў перыядзе алегорыі робіць яго яшчэ больш выразнай стылістычнай фігурай:

Увесь птушыны род там без разбору нацый
За творчай працай:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Хто гнёзды ўе, хто ловіць мошак –
Сваіх пісклівых корміць крошак,
Другі вартуе ў садзе дрэў –
Бароніць іх ад чарвякоў,
І працу ўсіх працаўнікоў
Бадзёрыць гучны спеў.
Адной вароне не пад густ.

*К. Крапіва. Варона-мітынгоўшчыца*

Прыведзены перыяд поўнасцю трымаецца на алегорыі, якая дапамагае пісьменніку вобразна, нагляднa і даходліва раскрыць узнятую праблему праз іншасказанне.

Перыяд, у якім быў бы выкарыстаны толькі нейкі адзін вобразны сродак, знайсці цяжка. Гэта аб'ёмная сінтаксічная канструкцыя, якая даволі часта з'яўляецца своеасаблівым мастацкім сінтэзам некалькіх тропаў. Цесна пераплятаючыся паміж сабой, розныя вобразныя сродкі кожны раз у перыядзе зліваюцца па-новаму. Спалучэнне тропаў у ім стылістычна апраўданае: яно служыць сродкам дасягнення асаблівай мастацкай вобразнасці, дапамагае пісьменніку ствараць яркія і выразныя вобразы, а праз іх выяўляць сваю ацэнку жыццёвых з'яў, свае адносіны да іх, а таксама ўздзейнічаць на рэцыпіента, на яго пачуцці і эмоцыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Каўрус А.А. Стылістыка беларускай мовы. – Мн., 1992.

2. Сцяцко П.У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П.У. Сцяцко, М.Ф. Гуліцкі, Л.А. Антанюк. – Мн.: Вышэйшая школа, 1990.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова